***Іна Алексніна***

## ЭЛЕМЕНТЫ ТЭАТРА Ў ВЯСЕЛЬНЫМ АБРАДЗЕ ЖЫХАРОЎ ЗАХОДНЯГА ПААЗЕР'Я

На тэрыторыі сучаснай Віцебшчыны, якая ўваходзіць у склад Беларускага Паазер'я, у выніку паглыбленных даследаванняў, этнаграфічных і культурных прыкмет, вучоныя-фалькларысты вылучаюць тры складаючыя яго зоны: ***Заходняя*** (Браслаўскі, Шаркаўшчынскі, Глыбоцкі, Докшыцкі, Міёрскі і Пастаўскі раёны), ***Цэнтральная*** (Лепельскі, Ушацкі, Чашніцкі, Расонскі, Верхядзвінскі, Полацкі раёны) і ***Усходнюю*** (Гарадоцкі, Віцебскі, Шумілінскі, Тапочынскі, Сенненскі, Аршанскі, Бешанковіцкі раёны). Кожная з іх мае як агульныя, так і адметныя рысы. Параўнаўшы паміж сабой апісанні абрадаў, навукоўцы заўважылі з аднога боку - іх аднароднасць (асноўныя абрады, якія ідуць у пэўнай паслядоўнасці), з другога - іх прыкметныя адрозненні.

Заходняе Паазер'е (або, па тэрміналогіі даследчыкаў з Рэгіянальнага культурна-асветніцкага цэнтра імя Я.Драздовіча М.А. і А.Э Райчонак, Прыдзісненскі рэгіён), мае багатую культурную, у тым ліку, і тэатральную, спадчыну. Да канца ХХ стагоддзя яна прыцягвала ўвагу пераважна фалькларыстаў і этнолагаў, сярод якіх А.Сапуноў-Друцкі, А.Чэрны, В.Камінскі, Л.Цыбульскі, А.Драеўскі, Д.Зяленін, Я.Драздовіч, Т.Кухаронак, В.Цітоў, З.Мажэйка, Т.Варфаламеева і іншыя. Даследчыкі падкрэсліваюць яе багацце і разнастайнасць, наяўнасць рэгіянальных асаблівасцей у вусна-паэтычнай і традыцыйнай творчасці ў адносінах да земляробчых і сямейна-абрадавых песень, шматгранную абрадавасць і надзвычай лакальную варыятыўнасць асобных яе элементаў. У канцы ХХ ст. з адметнай народнай спадчыны Дзісненшчыны найбольш вывучана песенная культура. Элементы тэатра ў сямейна-абрадавай творчасці беларусаў вывучаны недастаткова глыбока.

З сямейна-абрадавых свят, найбольш насычаных тэатралізацыяй і карнавальнымі сюнкамі, якія захаваліся і ў пачатку ХХ ст. натэрыторыі адзнчанага рэгіёна Беларусі, былі хрэсьбіны (крысціны) і вяселле.

Самым значным у сямейнай абраднасці беларусаў і іншых усходнеславянскіх народаў, было вяселле. На тэрыторыі нашай краіны дастаткова позна захоўваюцца старажытныя элементы вясельнай абраднасці. З цягам часу ў працэсе гістарычнага развіцця і пад уплывам грамадска-культурных змен, яны трацяць папярэднія прадуцыйна-рэгетацыйныя функцыі, у выніку чаго вяселле пачынае ўяўляць сабой яркае, каларытнае тэатралізаванае відовішча, у якім арганічна спалучаюцца розныя мастацкія кампаненты. Заўважым, што ў канцы ХХ ст. са стратай рытуальна-магічнага і сімвалічнага сэнсу, вясельны абрад яшчэ больш насычаецца відовішчна-гульнявымі элементамі якія нясуць адбітак шматлікіх міграцый насельніцтва і перапляцення мастацкіх традыцый з розных куткоў краіны.

«Беларускае вяселле - гэта «своеасаблівая опера» або «народная драма», сапраўды, мае шмат агульнага з драматургічным творам, прызначаным для сцэнічнага выканання. Вясельны сцэнарый у сваёй аснове меў не толькі аналагічную драме завязку, кульмінацыю і развязку, але і ролі, выпрацаваныя народным звычаем і замацаваныя ў абрадзе, а таксама і кампазіцыйна-структурную пабудову, дзе можна знайсці блізкі для драматургічнага твора прынцып падзелу на асобныя сцэны, эпізоды і г.д. Усё гэта кампазіцыйна збліжае вясельны абрад з драмай, хоць і не робіць іх з'явамі ідэнтычнымі» [3, с. 38]. Шлюб у кожнага народа свету ўспрымаўся як факт пераходу чалавека з дзяцінства ў сталасць, а права на гэты пераход трэба пацвердзіць у прысутнасці ўсяго роду. Доказам сталі абрады, якія прыцягвалі ўвагу глыбокім псіхалагізмам, сімвалізмам, выклікаными рытуальнасцю дзеяння.

Вясельная абраднасць аб'ядноўвала ў калектыў, у якім падзелу на выканаўцаў і гледачоў практычна не назіраецца. Кожны прысутны выконваў дакладную абрадавую ролю, мог выявіць свае мастацкія таленты ў непасрэдным дачыненні да дзейства. Традыцыйнае беларускае вяселле - невычэрпная крыніца арыгінальных ідэй для сапраўднага мастака, стымул для творчасці, разняволення фантазіі.

На Беларусі вяселле «гуляюць». Яго гульнёвы характар выяўляецца на ўсіх этапах абраду. Асабліва тэатралізаванымі можна назваць сватанне, выкупы нявесты, шлях для вясельнага поезда, месца за сталом, надзяленне маладых (пасаг), прыход на вяселле пераапранутых і інш.

Галоўнымі дзеючымі асобамі вяселля былі маладыя, сваты (старэйшы сват, «кіслы» («кубельны») сват, свацці, бацькі маладых, шаферы і шаферкі. Да выканаўцаў «другога плану», якія бяруць актыўны ўдзел у развіцці святочна-гульнявой дзеі, можна ўмоўна аднесці паднявесніц, баярак, каравайніц, жанчын-пявуняў і іншых гасцей, сярод якіх - пераапранутыя.

Высокімі былі патрабаванні да ролі галоўнага (у рэгіёне яго называлі «старшым») свата. Найчасцей яго выбіралі на сямейным савеце не па прынцыпу сваяцтва, а па ўзроўні ведання вясельнай традыцыі, арганізацыйных і мастацкіх здольнасцей, кемлівасці, валодання дарам слова і імправізацыі. Бо своеасаблівасць вясельнай абраднасці характарызуецца менавіта двухадзінствам традыцыйнай формы (наяўнасць паслядоўных этапаў дзеі, лаканічнае іх спалучэнне, характэрнае для пэўнай лакальнай адзінкі) і творчай імправізацыі. У вяселлі выяўляецца цеснае перапляценне драматычных пачуццяў і гуллівасці, сур'ёзнасці і забаўляльнасці відовішча. Таму майстэрства цікава «зрэжысіраваць» вяселле, зрабіць яго запамінальным на ўсё жыццё карысталася ў аднавяскоўцаў вялікай пашанай. Найбольш здольныя да гэтай справы выконвалі ролю свата шмат год запар, дасягалі ў пастаноўцы вясельнага відовішча сапраўднага прафесіяналізму.

Даследчык народных традыцый К.А.Цвірка заўважае аднароднасць вясельнай абраднасці на ўсёй тэрыторыі Беларусі: «Па шматлікіх апісаннях вяселля можна заўважыць, што асноўныя вясельныя абрады з пэўнымі адхіленнямі супадаюць ва ўсіх мясцовасцях. Адхіленні тычацца галоўным чынам мясцовых асаблівасцей, якімі дапаўняюцца абрад, тэрміны, песні» [5, с. 27]. З-пад увагі фалькларыста выпадае аспект, што ўзровень тэатралізацыі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

варыянтнасць яго выяўлення ў кожнай мясцовасці Беларусі розныя. Ён знаходзіцца ў цеснай залежнасці ад мастацкіх здольнасцей арганізатараў і ўдзельнікаў і не з'яўляецца такім устойлівым, як, напрыклад, у калядаванні. Па прычыне іх багатай лакальнай варыятыўнасці і імправізацыйнай асновы, дастаткова складанай падаецца задача апісаць тэатралізаваныя элементы ў традыцыйным беларускім вяселлі нават аднаго рэгіёна. Апытаныя намі інфарматары звярталі ўвагу больш на этапны парадак абраду, у прыватнасці, на яго традыцыйную аснову. Што тычыца тэатралізацыі, якая мае сваю сюжэтную аснову, эстэтычную мэтанакіраванасць і якой быў прапітаны ўвесь абрад, то, па сведчанні рэспандэнтаў з Дзісненшчыны, найбольш выразна яна назіраецца ў сватанні, шматлікіх выкупах і вясельных пераапрананнях.

На першым этапе разыгрывалі з бацькамі дзяўчыны імправізаваны спектакль, часцей за ўсё выдавалі сябе за купцоў ці паляўнічых. Напрыклад, пад'ехаўшы да варот нявесты, стукаліся і прасіліся ў хату: «Пусці ў хату, свацця / На печы пагрэцца, / На дзеваньку падзівіцца: / Ці харошая, / Ці ўбраная, / Ці нам спадабаная? / Ці харошая па лічаньку / Нашаму панічаньку ?» На што бацькі дзяўчыны адказвалі; «Сватове, Панове / Па што ж вы прыехалі? / Ці па гарох, / Ці па чачавіцу, / Ці па красную дзявіцу? / Наш гарох не малочаны, / А чачавіца ў капах стаіць, / А наша дзевачка ў косах сядзіць» [1]. У хаце прысутнічалі бацькі, сваякі і сяброўкі дзяўчыны, якую пакуль што хавалі ад сватоў.

Пасля паміж бацькамі нявесты і сватамі вялася «нікчэмная» гаворка (аб гаспадарцы, надвор'і), у час якой сват прыглядаўся да чысціні і парадку ў хаце. Калі яму ўсё было даспадобы, павольна пераводзіў гаворку на мэту прыходу: «Хадзілі мы, брадзілі па вашаму лесу, / Напалі на след пушнога звера. / Гналісь, гналісь за куніцай, / У сяло ўвагналі, ды след пацяралі. / Сталі шукаць - аж след пайшоў к вашай хаце. / Распыталіся ў людзей - аж то быў не пушны звер, / Не куніца, а красная дзявіца», і прасіў дазволу паглядзець на яе. Сваяк нявесты падводзіў да свата яе сяброўку і пытаў, ці добры тавар. На што сваты з боку жаніха адказвалі: «Тавар-та харош, да не наш. Пашукайце-ка нашага тавару. Наш чысцей ды ясней!» Так паўтаралася некалькі разоў. Урэшце рэшт сваяк дзяўчыны прапаноўваў ім пераапранутага нявестай хлопца, які ўсяляк імкнуўся спадабацца «купцам». Сват у сваю чаргу хваліў «дзяўчыну», яе гаспадарлівасць і прыгажосць: «Ну, чысцей гэтага тавару нельга ўжо сыскаць!» Сваты імкнуліся, не прыніжаючы гонару «нявесты», дабіцца мэты свайго прыходу [1].

Па ўсяму заходняму Паазер'ю пасля першых і другіх «заручын» і «абгледзін» гаспадаркі жаніха бытаваў прыгожы, паэтычны звычай развітання маладой са сваімі сяброўкамі напярэдадні вяселля, які атрымаў назву «сборная» («суборная», «зборная») субота. Галоўнай яе дзеяй было звіванне вянка для маладой. Асаблівым драматызмам быў насычаны гэты абрад у выпадку, калі маладая была сіратой. У час правядзення абраду, як і ў некаторыя моманты вяселля, маладая павінна была плакаць. Гэта лічылася добрай прыметай для шчаслівага жыцця ў шлюбе. Жанчыны, якія спявалі абрадавыя песні, выкарыстоўвалі ўсе свае артыстычныя здольнасці, каб выклікаць слёзы ў маладой [4].

Наступным этапам вяселля, характэрным для заходняга Паазер'я, быў «пасад» («пасаг»), які адбываўся як у доме маладога, так і маладой, дзе суправаджаўся адпаведнымі песнямі [4].

Багатымі на творчую імправізацыю былі шматлікія выкупы, якія сустракаліся амаль у кожнай складаючай частцы вясельнага абрадавага комплексу. На Пастаўшчыне, у в.Васіліны меў месца наступны звычай: пасля адоравання маладой (на другі дзень вяселля) жаніх, пераапрануты ў жаночае, намагаўся ўкрасці яе грошы. Старэйшая баярка пільна сачыла, каб гэтага не адбылося. Надзяленне маладой завяршалася вясёлай валтузнёй, у якую ўцягваліся ўсе прысутныя. У апошні дзень вяселля, пасля другога надзялення маладых, у хаце жаніха ўсё паўтаралася наадварот [4].

На шляху вясельнага поезда ладзілі «брамы» («рагаткі»), арганізатары якіх патрабавалі ад сватоў выкупу за вольны праезд. Тэкст - імправізаваны, часам з невялікімі сцэнкамі з пераапранутымі ў «цыган», «дзеда» ці іншых. На чале вясельнага поезда за гадзіну-паўтары да яго адпраўлення з дому маладой на другі дзень вяселля ехаў «кіслы сват» з «кубельнікамі», якія везлі пасаг маладой. У абавязкі свата ўваходзіла папярэдзіць аднавяскоўцаў аб часе праезду маладых. На галаве свата быў апрануты каўпак з кутасамі, упрыгожаны стужкамі, у руках - шумёлы (бразготкі). Яму абавязкова рабілі браму [4].

Па прыездзе да дому маладога жанчыны з ліку «кубельнікаў» раскладалі і развешвалі па пакоях пасаг маладой, стараліся ўкрасці што-небудзь з невялікіх рэчаў (курэй, чапёлы). Нібы замацоўваючы прывезенае дабро ў новай хаце, скакалі на лаўках. Добрай лічылася прымета, калі лаўкі ламаліся: «Гэта не прыданкі, што не паламалі лаўкі!» [4].

На Браслаўшчыне (в.Завер'е) на другі дзень вяселля існаваў звычай пераапранання ў «цыганоў» ці «жабракоў», якія хадзілі да свата «даіць казу». Такія паводзіны не сустракаюцца на тэрыторыі іншых мясцовасцей рэгіёна. Пераапранутыя (часцей жанчыны), бралі з сабой цадзілку (для «малака») і памяло («карміць казу»). Сват за добрае «кармленне» наліваў «малака» (гарэлкі). Калі пераапранутыя чым-небудзь не маглі дагадзіць свату, той доўга таргаваўся з імі за кожную кроплю «малака», а яны пускаліся на розныя выдумкі, каб атрымаць жаданае. Разыгрываўся своеасаблівы спектакль, насычаны гумарам, гледачы якога ўважліва сачылі за падзеямі, падказвалі свату, як паводзіць сябе з самазванымі памочнікамі ці чым лепш «пакарміць» казу, каб тая дала больш «малака» [2]. Сустракаліся і іншыя варыянты антрапаморфных пераапрананняў: падстаўныя маладыя, «доктар», «парыкмахер».

На вясельным застоллі гучала вельмі многа песень. Спявалі звычайна два гурты жанчын па два-тры чалавекі ў кожным. Адна з груп выконвала няцотныя радкі песні, другая - цотныя. Гэта менш стамляла спявачак, пазбаўляла манатоннасці песеннага афармлення абраду, надавала спевам дыялагічную форму, спрыяла лепшаму ўспрыняццю слухачамі. Сярод вясельнай песеннай спадчыны Дзісненшчыны шмат песень спявалі ад імя маладой і яе маці [4].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, небезпадстаўна можна сцвярджаць, што на тэрыторыі Прыдзісненскага рэгіёна традыцыйны вясельны абрад сінтэзаваў «... разнастайныя абрадава-гульнявыя элементы, формы і прынцыпы, выяўляў тым самым адну з характэрных асаблівасцей народнай ігравой культуры: імкненне да спалучэння генетычна і функцыянальна разнародных элементаў. Гэты ж прынцып у вышэйшай ступені ўласцівы таксама тэатральнаму мастацтву, дзе часта старажытныя элементы і формы суседнічаюць з гістарычна самымі познімі, элементарныя - з эстэтычна найбольш развітымі» [3 с. 46].

Тым не менш пры ўважлівым разглядзе вясельнага абраду заходняй Віцебшчыны, мы можам гаварыць аб адрозненні традыцыйнай асновы, нават у параўнанні з цэнтральным і ўсходнім Паазер'ем. Гэта выяўляецца ў наяўнасці «сборнай суботы» і «пасагу» (бытаваў і ў цэнтральнай частцы Паазер'я), не характэрных для Дзісненшчыны вясельных галашэннях, якія зафіксаваны даследчыкамі ў Лепельскім і Верхнядзвінскім раёнах і «стаўбавога абраду», уласцівага тэрыторыям Віцебскага, Гарадоцкага, Ліёзненскага, Шумілінскага, Талачынскага, Сенненскага, Дубровенскага, Аршанскага раёнаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ